УДК 821.161.3.09

# СПЕЦЫФІКА ГІСТАРЫЧНА-ДЭТЭКТЫЎНЫХ ТВОРАЎ Л. РУБЛЕЎСКАЙ

**А.У. Сузько,**
дацэнт, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі,
Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна,
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь
*E-mail:* suzko-1974@tut.by

**Г.М. Дзенісовіч,**
студэнтка філалагічнага факультэта
Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна,
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

У артыкуле аналізуюцца ідэйна-мастацкія асаблівасці гістарычна-дэтэктыўнай прозы сучаснай беларускай пісьменніцы Людмілы Рублеўскай. З дапамогай культурна-гістарычнага і параўнальна-гістарычнага метадаў выяўлены нацыянальныя літаратурныя традыцыі і наватарскія рысы ў яе творчасці, вызначана сувязь гісторыі і сучаснасці ў ёй, падкрэслена шматузроўневая, блізкая да постмадэрнісцкай, структура яе твораў. Зроблены вывад аб тым, што ў гістарычна-дэтэктыўных творах Людмілы Рублеўскай актуалізуюцца нацыянальныя прыярытэты і маральна-духоўныя каштоўнасці беларускаганарода.

Ключавыя словы: беларуская гісторыя, сучаснасць, дэтэктыў, постмадэрнізм, творчасць.

# SPECIFICS OF HISTORICAL-DETECTIVE WORKS BY L. RUBLEVSCAYA

**E.V. Suzko,**
associate Professor, Cand. Phil. D., associate Professorof the Department of Belarusian and Russian Philology,
Mozyr State Pedagogical University named after I.P. Shamyakin,
Mozyr, Republik of Belarus
E-mail: suzko-1974@tut.by

**A.N. Denisovich,**
student of the Faculty of Philology,
Mozyr State Pedagogical University named after I.P. Shamyakin,
Mozyr, Republik of Belarus

The article deals with conceptual and artistic features of historical-detective prose of the modern Belarusian writer Lyudmila Rublevskaya. National literary traditions and innovative features in her works are revealed using cultural-historical and comparative-historical methods, the connection of history and modernity is defined, the multi-level structure of her works close to postmodern is emphasized. It is concluded that the national priority and moral and spiritual values of the Belarusian people are actualized in historical-detective works by Lyudmila Rublevskaya.

**Key words:** Belarusian history, modernity, detective story, postmodernism, creative work.

**Уводзіны.** Творчасць Л. Рублеўскай прыкметна вылучаецца на агульным фоне сучаснай беларускай гістарычнай прозы. Відавочна, што яе творы нельга назваць цалкам гістарычнымі. Паколькі найчасцей за ўсё дамінантным храналагічным пластом яе твораў з’яўляецца сучаснасць з яе вострымі праблемамі страты маральна-духоўных арыенціраў грамадствам, бездухоўнасці, нацыянальнага нігілізму і гістарычнага беспамяцтва.

У іх гістарычны матэрыял перамяжоўваецца з авантурна-прыгодніцкімі, дэтэктыўнымі, філасофскімі, сацыяльна-псіхалагічнымі элементамі, што дае падставу многім даследчыкам гаварыць пра шматузроўневую структуру яе твораў, творчае перайманне пісьменніцай вопыту сучаснага постмадэрнісцкага досведу (Д.Бугаёў, В. Шынкарэнка, В. Лысова, І. Шаўлякова і інш.).

**Мэты і задачы.** Л. Рублеўская ў асэнсаванні беларускай гісторыі абрала для сябе шлях нацыянальна-духоўнага светапазнання.Так, І. Шаўлякова лічыць, што яна стварае ў межах сваіх мастацкіх вопытаў музей, у якім “гістарычны факт, падзея альбо постаць вырастаюць да самастойнага экспанату ў тым музеўме, дзе Людміла Рублеўская збірае найбольш каштоўнае – для сябе, сваіх дзяцей і свайго народу…” [6, с. 56].

Праявай бясспрэчнага наватарства пісьменніцы ў галіне беларускай гістарычнай прозы, на нашу думку, сталі эксперыменты аўтара ў рэчышчы пошуку жанраўпаліфанічнага зместу. “Дзякуючы ёй, – лічыць В. Лысова, нацыянальная гістарычная проза апошніх дзесяцігоддзяў стала яскравым прыкладам жанравай дыфузнасці і разамкнёнасці” [3, с. 12]. У высвятленні спецыфікі гістарычна-дэтэктыўнай прозы

МГПУ им. И.П.Шамякина

Л. Рублеўскай і заключаецца мэта нашага даследавання.

**Метады і матэрыял даследавання.** Вызначэнню адметнасці гістарычна-дэтэктыўнай прозы Л. Рублеўскай садзейнічае выкарыстанне культурна-гістарычнага, параўнальна-гістарычнага метадаў даследавання. Творы Л. Рублеўскай (аповесці “Пярсцёнак апошняга імператара”, “Сэрца мармуровага анёла”, раманы “Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію”, “Золата забытых магіл” і інш.) унікальныя паводле аўтарскіх кампазіцыйна-сюжэтных рашэнняў і вольнага абыходжання з катэгорыяй мастацкага часу. У межах аднаго твора пісьменніца можа апераваць некалькімі часавымі зрэзамі. Як, напрыклад, у аповесці “Пярсцёнак апошняга імператара”, дзе ў адным мастацкім цэлым суіснуюць падзеі другой паловы XV стагоддзя, калі пад націскам асманаў знікла з палітычнай карты свету Візантыйская імперыя; пачатак XX стагоддзя, калі, паводле ўмоўна-мастацкага мыслення Л. Рублеўскай, перадавое, вольналюбівае студэнтцва марыла аб стварэнні Каралеўства Беларусь; гады культу Сталіна; пераходны момант паміж XX і XXI стагоддзямі. Такі тып арганізацыі тэкставай prасторы дазваляе прасачыць сувязь паміж мінулым і сучаснасцю, убачыць, як гістарычныя ўрокі былі ўлічаны наступнымі пакаленнямі. Яе героі – нашы сучаснікі – з’яўляюцца нашчадкамі тых, хто некалі здзяйсняў у мінулым высакародныя альбо ганебныя ўчынкі, яны адказваюць за грахі і славу сваіх продкаў.Пісьменніца лічыць, што мастацкі час – гэта не столькі катэгорыя фізічная, колькі духоўна-маральная, хрысціянска-пакаяльная.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для мастацкай структуры твораў Л. Рублеўскай увогуле характэрна паралельнасць сюжэтных ліній, паралельнасць дзеяння ў розных часавых варунках. Адзін з яе раманаў нават атрымаў жанравае вызначэнне “паралельны раман” (“Золата забытых магіл”). Дзеянне ў творы рухаецца паралельна ў XXI стагоддзі, калі ўжыцці Паліны Ведрыч, нашай сучасніцы, з’яўляецца каменная жабка з надмагілля паўстанца 1863 года Вінцэся Рашчынскага; і ў XIX стагоддзі, падчас паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Інтрыга падтрымліваецца і тым, што Паліна Ведрыч і Вінцэсь Рашчынскі звязаны паміж сабой кроўнымі, роднаснымі сувязямі, пра якія гераіня пакуль не здагадваецца. Пісьменніца ўздымае ў творы важныя праблемы, якія існавалі і ў ходзе самога паўстання: непаразуменне паміж сялянамі і актыўнай шляхтай, нянавісць, варагаванне паміж імі, лёс інсургентаў, іх сем’яў, трагічны лёс былога паўстанца, які ў юнацтве марыў аб грамадстве, заснаваным на справядлівасці, верыў у сумленнасць, шчырасць і высакароднасць іншых людзей, але стаў “здраднікам” і выгнаннікам па волі лёсу. Якраз рамантызацыя і белетрызацыя садзейнічаюць актуалізацыі гэтых праблем і прымушаюць чытача думаць, разважаць, крытычна ставіцца да сучаснасці і да гісторыі.

Поліфанізму твораў Л. Рублеўскай спрыяе і канфлікт паміж вечным і часовым, гераічным і меркантыльным, увасоблены ў сюжэтнай структуры яе твораў, напрыклад, на ўзроўні асабіста-інтымнага жыцця персанажаў. Драматычны сэнс гэтага канфлікту асабліва відавочны ў лёсе тых, хто ахвяруе сабой, сваім жыццём дзеля высокіх ідэй, дзеля Айчыны, як гэта было, напрыклад, з Вінцэсем Рашчынскім, што атрымаў золата ад пана Людвісара за тое, што пайшоў на смерць за яго сына, страціў лепшага сябра Марка Рагманава, які вырашыў ахвяраваць сабой, і так і не даведаўся, што атрыманае золата было фальшывым. Толькі нашчадкі даведваюцца пра гэты падман і разумеюць усю ступень чалавечага падзення і ўзвышэння. І. Шаўлякова, аналізуючы творчасць Л. Рублеўскай, адзначала, што яна “звяртаецца да падзей і людзей выключных, ахутаных арэолам не проста гераічным, але гераіка-трагедыйным, ахвярна-пакутніцкім” [6, с. 18].

Ідэя трывалай сувязі гісторыі і сучаснасці ўвасоблена ў творах Л. Рублеўскай. Невыпадкова ў размове з Г. Булыка пісьменніца прызнавалася: “Для мяне няма ні мінулага, ні цяперашняга, ні будучага часу. Час – гэта нешта іншае, чым мы яго ўяўляем… У цяперашнім ёсць і мінулае, і будучае – трэба толькі адчуць гэта” [2, с. 4].Невыпадкова некаторыя даследчыкі адзначаюць, што яна мадэрнізуе гісторыю, адыходзіць ад уласна гістарычных падзей і фактаў. Гісторыя, яе дыханне ўзнікаюць у яе творах дзякуючы выпадкова знойдзеным альбо атрыманым у спадчыну прадметам, рэчам, лістам. Так, Магда Дарбут, наша сучасніца, студэнтка, аказваецца нашчадкам апошняга візантыйскага імператара з роду Палеолагаў, а Паліна Ведрыч – паўстанцкага філосафа і рамантыка Вінцэся Рашчынскага.

Суадносіны сучаснасці і мінулага цікавяць пісьменніцу і ў рамане-інструкцыі «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію». Тут яна звяртаецца да гісторыі савецкага перыяду, эпохі культу асобы Сталіна, калі грамадства паглынула цемра страху, недаверу.У размове з журналісткай Таццянай Будовіч-Барадуляй пісьменніца адзначала: “Караткевіч пачаў стварэнне міфа, у які ўключана Беларусь інсургенцкая, Беларусь рыцарская. Я сюды яшчэ дадаю Беларусь рэпрэсаваную – гэта новы пантэон нацыянальных герояў, якіх неабходна ведаць...” [4, с. 5].

Творы Л. Рублеўскай даволі часта становяцца трыбунай для праманаўлення яе грамадзянска-патрыятычных поглядаў, надзейным сродкам для ўвасаблення нацыянальнай ідэі. Так і ў гэтым рамане, наватарскім як паводле формы, так і паводле зместу, пісьменніца чарговы раз паказвае, як развівалася нацыянальная ідэя і як яна выжыла

МГПУ им. И.П.Шамякина

ў неспрыяльных сацыяльна-палітычных умовах, напрыклад, такіх, як час масавых рэпрэсій 20–30-х гадоў XX стагоддзя.

Сюжэт рамана просты і ў той жа час ускладнены паэтыкай навейшага часу. Прадстаўнікі сучаснага маладога пакалення (Даліла-Дар'я, Генусь, Макс, Едрусь, Руслана) сталі зусім нечакана спадчыннікамі старой жанчыны і атрымалі ад яе хату ў Мінску. Аўтар шчодра карыстаецца магчымасцямі сучасных жанраў: фантастыкі, фэнтэзі, альтэрнатыўнай гісторыі, бо атрыманы дом меў часавы партал, які дазваляў перамяшчацца з XXI стагоддзя амаль на пачатак XX – у час масавых рэпрэсій і арыштаў. Маладыя людзі перамяшчаюцца такім чынам з Мінска 2000-х у Менск 1933 года і спрабуюць актыўна ўмяшацца ў падзеі таго часу, каб выратаваць ахвяр сталінскіх рэпрэсій, змяніць ход гісторыі.

Людміла Рублеўская як чалавек новага часу мысліцькрытычна, усведамляе, што спроба карэкцыі гісторыі пагражае пэўнымі стратамі для чалавека. Таму ўдзельнікі гульні становяцца не проста назіральнікамі гістарычных падзей, а актыўнымі суб'ектамі дзеяння, ахвярамі, якія расплачваюцца за гульню сваім жыццём. Сама жанравая форма рамана-інструкцыі з'яўляецца наватарскай, бо пад інструкцыяй мы звычайна разумеем шэраг рэкамендацый, як карыстацца тым ці іншым прадметам, той ці іншай рэччу, у дадзеным выпадку часавым парталам. І. Шаўлякова лічыць, што твор з'яўляецца «квэстам», які складаецца з «канструктару-набору» нумараваных элементаў: «Уводзіны», «Удзельнік...» (5 гульцоў), «Абсталяванне для гульні», «Гульня» (6 «версій-гісторый»), «Па-за гульнёй» (8 «фрагментаў»), «Фінальная гульня» (2 «версіі-гісторыі»), «Эпілог» (6 «камбінацый») [7]. Даследчыца адзначае, што, калі твор быў размешчаны на сайце "Родныя вобразы", то "набыў уласцівасці сапраўднага гіпертэксту [прыкмета постмадэрнізму – А.С.], у межах якога карыстальнік можа абіраць сваю траекторыю гульні.." [7].

Значная роля належыць Л. Рублеўскай і ў галіне распрацоўкі дэтэктыўнага жанру ў беларускай літаратуры. Гістарычна-дэтэктыўныя творы Л. Рублеўскай, на нашу думку, уражваюць не толькі вастрынёй сюжэтных паваротаў, мноствам таямніц, але і актуальнасцю ўзнятых маральна-этычных праблем, неардынарнасцю герояў альбо гераінь, якія па сваёй уласнай волі далучаюцца да працэсу расследавання крымінальнай справы, хоць не з'яўляюцца прафесійнымі следчымі. Пошук злачынцаў, пошук украдзеных скарбаў – справа іх сэрца, іх сумлення (Магда Дарбут з аповесці "Пярсцёнак апошняга імператара", Кася з аповесці "Сэрца мармуровага анёла", Паліна Ведрыч з рамана "Золата забытых магіл" і інш.).

Так, Паліна Ведрыч працуе настаўніцай гісторыі ў адной з мінскіх гімназій, займаецца навуковымі даследаваннямі і цікавіцца старажытнымі артэфактамі, якія для яе найперш уяўляюць духоўную, а не матэрыяльную каштоўнасць. Патрыятычныя перакананні Паліны не выклікаюць адабрэння ў адміністрацыі гімназіі, але яе сумленная і адказная праца не дазваляе ім звольніць яе. Неабходна адзначыць, што гераіні альбо героі твораў Л. Рублеўскай – найчасцей прадстаўнікі сучаснай інтэлігенцыі, апантаныя самой ідэяй культуры, гісторыі, узвышаныя, высакародныя, якія знаходзяцца ў канфлікце з рэчаіснасцю. Аб'ектам яе навуковых даследаванняў становіцца паўстанне 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага і сама асоба ідэйнага натхняльніка гэтай гістарычнай падзеі. Паліна, як і ўсе гераіні Л. Рублеўскай, – самадастатковая асоба, для якой найважнейшую ролю набывае ўстанаўленне справядлівасці. Таму менавіта яна ходам усяго дзеяння прызначана для разгадкі адной з таямніц беларускай гісторыі, звязанай з паўстаннем 1863 года, з лёсам філосафа і рамантыка Вінцэся Рашчынскага.

Дзеянне пераносіцца пісьменніцай з XX у XIX стагоддзе і наадварот. Так, спачатку мы бачым, як сябар Паліны Артур прыносіць на продаж ёй каменную жабку з надмагілля Вінцэся Рашчынскага, а ў другім раздзеле, здаецца, без усялякай сувязі, аўтар вяртае чытача ў XIX стагоддзе, дзе закаханы Вінцэсь Рашчынскі думае праявіць адвагу і забіць ваўкалака, пра якога ходзіць пагалоска ў яго родных Гарнушках, каб стаць героем у вачах каханай. Такім чынам, двухпланавасць аповеду дазваляе надаць сюжэту дынамізм і загадкавасць.

Безумоўна, у мастацкім вопыце Л. Рублеўскай прасочваюцца караткевічаўскія традыцыі. Яго імя, дарэчы, неаднойчы згадваецца на старонках рамана "Золата забытых магіл". Як і Андрэй Беларэцкі з аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха", і Антон Космiч з рамана "Чорны замак Альшанскі", Паліна цікавіцца гісторыяй. Усе яны міжволі раскрываюць злачынствы, распачатыя яшчэ ў далёкай старажытнасці. Згадаем, што Андрэй Беларэцкі спрабуе разгадаць таямніцу прывіднага палявання, легенда пра якое датуецца XVII стагоддзем; Антон Космiч займаецца пошукам скарбаў, схаваных паўстанцамі ў XVI ст. Кожны з іх разумее, што мэта пошукаў – не ў скарбах, а ў вяртанні гістарычнай праўды, гістарычнай справядлівасці альбо добрага імя героям мінулых гадоў, як гэта было ў выпадку з Вінцэсем Рашчынскім.

З У. Караткевічам пісьменніцу яднае і тэма паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Але звяртаецца яна не да асоб славутых, чые імёны засталіся ў падручніках па гісторыі Беларусі, а да імя, жыцця і дзейнасці таго, каму ўдалося выжыць пасля разгрому паўстання,

МГПУ им. И.П. Шамякина

заслужыць "нянавісць" народа, дзеля вызвалення якога і было задумана само паўстанне. Як і ў Караткевіча, значную ролю ў фарміраванні духоўна-маральнага, псіхалагічнага статусу герояў адыгрываюць памяць роду, родавыя пракляцці. Згадаем, што Надзея Яноўская з аповесці У. Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" з'яўлялася апошнім адгалінаваннем роду Яноўскіх, на які каралём Стахам, паводле легенды, было накладзена праклянцце. А Вінцэсь Рашчынскі нясе родавы цяжар віны за бесчалавечныя лютыя ўчынкі свайго дзеда Ганорыя Рашчынскага, за яго здзек над прыгоннымі сялянамі.

У дэтэктыўную тканіну твора Л. Рублеўская ўдала "ўплятае" вострыя праблемы сучаснасці, актуальныя пытанні беларускага быцця, што надае твору сацыяльную завостранасць. Сацыяльны падтэкст і ўвага да праблем нацыянальнага быцця прысутнічаюць і тады, калі пісьменніца асэнсоўвае лёс творчых і таленавітых людзей Беларусі, што сталі ахвярамі рэжыму альбо перайшлі дарогу злачынцам. Так, маці ў адказ на пытанне Паліны пра бацьку, пра якога дзяўчына амаль нічога не чула, расказала, што ён вучыўся на рэжысёрскім факультэце ў тэатральным інстытуце і для курсавой работы ўзяўся ставіць п'есу заходнебеларускага пісьменніка, аб'яўленага потым ворагам народа. А яшчэ «*і поўху замдэкана адвесіў. А той з органаў – усе ведалі*». Тады Рагманава асудзілі «*на прымусовае пасяленне ледзь не ў тундру*». Маці ж, тады камсамолку, прымусілі публічна «*каяцца, выкрываць антысаветчыка*». Дачка вырасла без бацькі, з матчыным прозвішчам (каб нішто не нагадвала пра адыёзнага па савецкіх мерках бацьку).

У падобным рэчышчы паказаны і лёс таленавіта мастака Артура, які, не вытрымаўшы жыццёвых выпрабаванняў, пачаў моцна піць. Вынікам стала невылечная хвароба, частковая дэградацыя і смерць на сметніку. Але падобная сацыяльна завостраная карціна пабудавана аўтарам з мэтай абвастрэння дэтэктыўнага дзеяння. Пазней высвятляецца, што Артур не памёр уласнай смерцю, а быў атручаны клафелінам, бо стаў сведкам і міжвольным удзельнікам злачынстваў і звязаных з ім пошукаў скарбаў.

Менавіта прынесеная Артурам каменная жабка становіцца штуршком да разгортвання дэтэктыўнага сюжэту. Яна звязана з асобай загадкавага і таямнічага ўдзельніка паўстання 1863 года Вінцэся Рашчынскага, які пасля разгрому паўстання апынуўся за мяжой і вярнуўся на радзіму ўжо толькі напрыканцы стагоддзя. Вінцэся Рашчынскага забілі аднавяскоўцы, сяляне, якія, кіруючыся памяццю пра яго празмерна жорсткага дзеда, што ўяўляўся ім чарнакніжнікам, аўтаматычна перанеслі на яго грахі продка: «*Табе цмок золата носіць. Ты ў магіле прадзеда Чорную Кнігу адкапаў. Цмок вылупляецца з яйка пеўня. Вынасіў яго пад пахай… Ён табе яшчэ прынясе… Дабром просім – аддай золата! А то абыдземся, як з ведзьмаком і чарнакніжнікам належыць!*» [5, с. 339].

Першая жабка з надмагілля Рашчынскага стала штуршком для раскрыцця забойстваў, здзейсненых не толькі ў сучаснасці, але і ў мінулым. Як майстар авантурна-прыгодніцкага сюжэта, Л. Рублеўская і тут выкарыстоўвае прыём канцэнтрацыі загадкавага, таямнічага. У звычайнай жабцы, якая не мела ніякай культурнай каштоўнасці, быў схаваны ключ да сапраўдных скарбаў, бо яна з'яўлялася часткай зашыфраванага ў скульптурнай кампазіцыі надмагілля паслання нашчадкам ад Вінцэся Рашчынскага. Вінцэсь, відавочна,спадзяваўся, што разумныя і здагадлівыя нашчадкі здолеюць разгадаць яго ліст і выкарыстаць схаванае золата на карысць Бацькаўшчыне. Золата паўстанцаў, схаванае ў магіле Рашчынскага, аказалася падманам, бо замест яго паляўнічыя атрымалі пустыя металічныя балванкі. Крута разгорнутая сюжэтная загадка ў рамане застаецца неразгаданай. Пісьменніца нібыта дае магчымасць чытачам задумацца над тым, што вечнае, а што імгненнае, што мае каштоўнасць і што не мае ніякай каштоўнасці.

Але наватарства Л. Рублеўскай заключаецца не толькі ў памнажэнні жанравых магчымасцей дэтэктыва, але і ў праблемах, узнятых у яе творах. Так, адной з галоўных ідэй рамана з'яўляецца думка пра адказнасць нашчадкаў за справы продкаў. Калі Вінцэся катуюць, ён думае, што сваімі пакутамі, магчыма, сплоціць «*грахі свайго роду, увесь боль, які спарадзіў яго род*», галоўны з якіх – жорсткае абыходжанне з сялянамі.

Даследчык Д. Бугаёў меркаваў: "…Інтэлектуальная заглыбленасць твора найбольш ярка выяўляецца ў спрэчках розных персанажаў і ў аўтарскіх разважаннях пра самыя высокія матэрыі – пра сувязь мінулага, сучаснага і будучыні, гістарычныя карані беларусаў, свабодалюбства і тыранію, поўнае самапрыніжэнне рабоў, якія канчаткова страцілі самую мару пра вызваленне і ўжо гатовы ўслаўляць тыранаў, што ўладараць над імі, і інш." [1, с. 211].

**Вывады.**Гістарычна-дэтэктыўныя творы Л. Рублеўскай, структурна арганізаваныя паводле законаў постмадэрнісцкага пісьма, постмадэрнісцкай паэтыкі, такім чынам, падпарадкаваны найперш задачам сцвярджэння нацыянальных прыярытэтаў і маральна-духоўных каштоўнасцей беларусаў. Навізна творчай манеры пісьменніцы заключаецца і ў тым, што ў кантэкст гістарычных палотнаў ёю ўводзіцца сучаснасць з яе вострымі праблемамі. У межах гістарычна-дэтэктыўнай прозы пісьменніца закранае такія праблемы, як адказнасць чалавека перад сучаснасцю і гісторыяй, неабходнасцьпавагі да



МГПУ им. И.П. Шамякина

памяці продкаў, вяртанне гістарычнай праўды і справядлівасці, а таксама праблему бездухоўнасці сучаснага беларускага грамадства, яго сацыяльнага і нацыянальнага нігілізму.

**Літаратура**

1. Бугаёў, Д. Беларускі дэтэктыў Людмілы Рублеўскай / Д.Бугаёў // Полымя. – 2006. – № 7. – С. 207–212.
2. З табою. З Л. Рублеўскай гутарыць Галіна Булыка // Крыніца. – 2000. – № 11–12. – С. 4–16.
3. Лысова, Н. Гістарычная проза Людмілы Рублеўскай: да характарыстыкі жанру / Н. Лысова // Вестник Полоцкого гос. ун-та. Серия А. Гуманит. науки. – 2013. – № 10. – С.12–17.
4. Людміла Рублеўская: “Не здавацца. Не баяцца. Гарэць!”: З Людмілай Рублеўскай гутарыць Таццяна Будовіч-Барадуля // Літаратура і мастацтва. – 13 лістапада. – 2017. – С. 5.
5. Рублеўская, Л.І. Сэрца мармуровага анёла: аповесці, раман / Л.І. Рублеўская. – Мінск: Маст. літ., 2012. – 350 с.
6. Шаўлякова, І.Л. Сапраўдныя хронікі Поўні: артыкулы і рэцэнзіі / І.Л. Шаўлякова. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2011. – 184 с.
7. Шаўлякова, І. Адказы (для абітурыентаў “Альбарутэніі”) / І. Шаўлякова // Рэжым доступу: //http:www.lir-book.by. Дата доступу: 08.02.2019.

**References**

1. Bugajow D. (2006). Belaruski djetjektyw Ljudmily Rublewskaj. *Polymja.* [Belarusian detective by Lyudmila Rublevscaya]. 7, 207–212. (In Bel.)
2. Z taboju. (2000). Z L. Rublewskaj gutaryc" Galina Bulyka.*Krynica.* [WithLyudmilaRublevskayaGalinaBulykaspeaks]. 11–12, 4–16. (In Bel.)
3. LysovaN. (2013). Gistarychnaja proza Ljudmily Rublewskaj: da haraktarystyki zhanru. *Vestnik Polockogo gos. un-ta.Serija A. Gumanit. nauki.*[Thehistorical works by Lyudmila Rublevscaya: to characteristic of a genre. *Bulletin of Polock University. Humanities*].10, 12–17. (In Bel.)
4. Ljudmila Rublewskaja (2017): “Ne zdavacca. Ne bajacca. Garjec"!”: Z Ljudmilaj Rublewskaj gutaryc" Taccjana Budovich-Baradulja. *Litaratura i mastactva.*[LyudmilaRublevskaya“Not to be given. Not to be afraid. To burn!”: WithLyudmilaRublevskayaTatyana Budovich-Baradulyaspeaks]. 13, 5. (In Bel.)
5. Rublewskaja L.I. (2012). *Sjerca marmurovaga anjola: apovesci, raman. [Heart of a marble angel: stories, novel].*Minsk: Mast. lit. (In Bel.)
6. Shawljakova I.L. (2011). *Saprawdnyja hroniki Powni: artykuly i rjecjenzii. [Present chronicles of the Moon: articles and reviews].* Minsk: Litaratura i mastactva. (In Bel.)
7. Shawljakova I. (Ed.) (2019). Adkazy (dlja abituryentaw “Al"barutjenii”) [The Answers: for entrants of Albaruteniya]. //http:www.lir-book.by. (In Bel.)

МГПУ им. И.П.Шамякина